# Ад БССР да Рэспублікі Беларусь

**Набыццё суверэнітэту**



# Змест

- Узмацненне руху за нацыянальна-дзяржаўны суверэнітэт Беларусі.
- Афармленне дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь.
- Увядзенне новых дзяржаўных сімвалаў рэспублікі.
- Выбары Прэзідэнта РБ
- Пытанні для самакантролю
- Вывад



# Узмацненне руху за нацыянальна-дзяржаўны суверэнітэт Беларусі.

Канец 80-х — пачатак 90-х гадоў у гісторыі СССР адзначаўся ажыўленнем і хуткім нарастаннем руху народаў за набыццё рэспублікамі сапраўднага дзяржаўнага суверэнітэту.Першымі да практычнай рэалізацыі гэтых мэт прыступілі Прыбалтыйскія рэспублікі. У сакавіку 1990 года Вярхоўны Савет Літвы першым з рэспублік СССР абвясціў аб аднаўленні поўнага дзяржаўнага суверэнітэту Літвы. Аб сваім суверэнітэце абвясцілі таксама Латвія і Эстонія.



На Беларусі рух за нацыянальнае адраджэнне і незалежнасць ад цэнтра таксама ўзмацніўся, але ён прадугледжваў перш за ўсё, у адрозненне ад Прыбалтыйскіх рэспублік, карэннае пераўтварэнне Саюза ССР у сапраўды дэмакратычную прававую дзяржаву, заснаваную на добраахвотным аб'яднанні раўнапраўных суверэнных рэспублік.



27 ліпеня 1990 года Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі, якая азначала, што Беларусь выбрала ўласны шлях развіцця, хоць і не выключала магчымасці аб'яднання разам з іншымі рэспублікамі ў новы Саюз.

Працэс падрыхтоўкі новага Саюзнага дагавора быў прыпынены ў сувязі з падзеямі ў Маскве, якія атрымалі назву жнівеньскага 1991 года путчу, у ходзе якога быў створаны Дзяржаўны камітэт па надзвычайнаму становішчу (ГКЧП). Звесткі аб жвевеньскім путчы ў Маскве быў успрыняты кіраўніцтвам КПБ. Дэмакратычныя сілы рэспублікі адкрыта выступілі супраць змовы. Путч праваліўся.



# Афармленне дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Важнае значэнне для практычнага замацавання суверэнітэту рэспублікі і пераўтварэння яе ў незалежную дзяржаву мела рашэнне, прынятае Вярхоўным Саветам 25 жніўня 1991 года, аб наданні канстытуцыйнага статуса Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР.

18 кастрычніка 1991 года быў прыняты Закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь», якое з'яўляецца неад'емным атрыбутам дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі.



# Гістарычны факт

Складаныя працэсы набыцця РБ, як і іншымі рэспублікамі Саюза ССР, прывялі да прыняцця 8 снежня 1991 года пагаднення, якое падпісалі кіраўнікі Беларусі, Расійскай Федэрацыі і Украіны, аб стварэнні Садружнасці Незалежнах Дзяржаў (СНВ). Гэтае пагадненне атрымала ў гісторыі назву “Белавежскага”. Ад Беларусі яго падпісалі Станіслаў Шушкевіч, які ў той час з’яўлялся Старшынёй Вярхоўнага Савета, і Вячаслаў Кебіч, тагачасны Старшыня Савета Міністраў.

10 снежня Вярхоўны Савет РБ ратыфікаваў Белавежскія пагадненні і адначасова прыняў пастанову аб дэнансацыі дагавора 1922 года аб утварэнні СССР.



# Гістарычны дакумент

У пагадненні абвяшчалася, што Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік як суб’ект міжнароднага права і палітычная рэальнасць спыніў сваё існаванне. Тры дзяржавы аб’ядналіся ў СНД і запрасілі ўступіць у Садружнасць іншыя дзяржавы былога СССР. Цэнтрам СНД стала сталіца Беларусі. Распрацаваны і прыняты шэраг дакументаў, у тым ліку Устаў СНД. Дзейнічае міжпарламенцкае аб’яднанне, цэнтр якога знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу.



# <u>*Гістарычны факт.*</u>

*У лютым 1995 года Беларусь прымала Прэзідэнта Расійскай Федэрацы Б. М. Ельцына. У час візіту былі падпісаны Дагавор аб дружбе, добрасуседстве супрацоўніцтве паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь, Пагадненне аб сумесных намаганнях па ахове дзяржаўных граніц Рэспублікі Беларусь.*



# Увядзенне новых дзяржаўных сімвалаў рэспублікі

**_Гістарычны факт._**

*19 верасня 1991 года Вярхоўны Савет прыняў Закон аб назве Беларускай ССР, у адпаведнасці з якім з гэтага дня яна пачала называцца «Рэспублікай Беларусь». Была зацверджана і дзяржаўная сімволіка.*



*Аднак 14 мая 1995 года на рэферэндуме большасць насельніцтва прагаласавала за ўвядзенне новых дзяржаўных сімвалаў рэспублікі: сучасны герб і сцяг.*





# Дзяржаўны герб РБ



# Дзяржаўны сцяг РБ





# Выбары Прэзідэнта РБ

У замацаванні суверэнітэту Рэспублікі Беларусь асобае месца належыць Канстытуцыі, якая была прынята Вярхоўным Саветам 15 сакавіка 1994 года Канстытуцыя ўстанавіла і новую — прэзідэнцкую форму дзяржаўнага кіравання, па якой Прэзідэнт з'яўляецца Кіраўніком дзяржавы.



Выбары першага Прэзідэнта РБ, адбыліся 23 чэрвеня 1994 года, у якім удзельнічала 6 прэтэндэнтаў. Паколькі ніхто з іх не набраў больш за палову галасоў выбаршчыкаў, 10 ліпеня 1994 года адбыўся другі тур выбараў, у якіму дзельнічалі В. Ф. Кебіч і А. Р.Лукашэнка. Большасць выбаршчыкаў (звыш 80 %) аддалі свае галасы за А.Р.Лукашэнку.

20 ліпеня 1994 года на сесіі Вярхоўнага Савета адбылася цырымонія ўступлення Прэзідэнта на пасаду.





# Гістарычны партрэт





Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь — Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. Нарадзіўся 30 жніўня 1954 года ў пасёлку Копысь Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Пасля заканчэння сярэдняй школы паступіў у Магілёўскі педагагічны інстытут на гістарычны факультэт, які скончыў у 1975 годзе. Служыў у Савецкай Арміі, пасля чаго займаў розныя кіруючыя пасады ў гаспадарчых органах, у калгасах і саўгасах. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Падчас выбараў у Вярхоўны Савет БССР у 1990 годзе стаў яго дэпутатам.

У 1994, 2001, 2006 годзе быў абраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.




Аднак на шляху будаўніцтва маладой дзяржавы ўзніклі непрадбачаныя цяжкасці, якія былі звязаны з недакладнасцямі новай Канстытуцыі. У прыватнасці, у ёй недастаткава выразна праводзілася раздзяленне функцый і паўнамоцтваў паміж уладамі, што прывяло ў 1996 годзе да ўнутрыпалітычнага крызісу ў краіне.

З мэтай выйсці з яго Прэзідэнт выступіў з ініцыятывай правядзення рэспубліканскага рэферэндуму па пытанню прыняцца новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі і па некаторых іншых пытаннях.

Рэферэндум адбыўся 24 лістапада 1996 года. Яго вынікі сведчаць аб шырокай падтрымцы народам Беларусі курсу Прэзідэнта па пераадоленню палітычнага крызісу і ўстанаўленню стабільнасці ў краіне.

Увогуле па сваіх галоўных параметрах Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь адказвае стандартам канстытуцый тых краін, якія заснаваны на прынцыпах дэмакратыі.

Пры прэзідэнцкай форме кіравання Прэзідэнт фарміруе вышэйшы выканаўчы орган улады і нясе адказнасць за яго дзейнасць.




# Гістарычны факт

19-20 кастрычніка 1996 года ў Мінску адбыўся першы Усебеларускі народны сход, які зацвердзіў “Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996-2000 гады”.

Выпаўненне асноўных паказчыкаў развіцця краіны на 1996-2000 гады дазволілі РБ першай на постсавецкім асяродзі пераадолець крызісныя з’явы ў эканоміцы.

З улікам вынікаў рэалізацыі мадэлі эканамічнага развіцця другі Усебеларускі народны сход у 2001 годзе падтрымаў асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2001-2005 годы.

На трэцім Усебеларускім народным сходзе ў 2006 годзе вызначана Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2006-2010 годы. Галоўная задача – далейшы рост дабрабыту беларускага насельніцтва.



# Вывад

Устанаўленне дзяржаўнай незалежнасці Беларусі стала вынікам усяго папярэдняга гістарычнага развіцця рэспублікі. Наша Радзіма набыла сапраўдны суверэнітэт, які прызнаны ўсім сусветным супольніцтвам. Аднак вывад краіны з крызісу аказаўся цяжкавырашальным і няхуткім як у галіне эканомікі, так і унутрыпалітычнага жыцця.

Прычынай таму шматлікія цяжкасці эканамічнага, палітычнага, сацыяльнага, а таксама псіхалагічнага характару, якія ўскладніліся ў пачатку 90-х гадоў у сувязі з распадам СССР, які большасць насельніцтва ўспрымала як сваю адзіную вялікую Радзіму.





# Пытанні для самакантролю

№1. *Наданне нашай краіне назвы Рэспубліка  Беларусь адбылося:*

А) 27 ліпеня 1990г.,

Б) 25 жніўня 1991г.,

В) 19 верасня 1991г.,

№2. *Сучасная дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь прынята:*

А) 27 ліпеня 1990г.,

Б) 19 верасня1991г.,

В) 14 мая 1995г.,



№3. *Форма дзяржаўнага кіравання ў Рэспубліцы Беларусь:*

А) парламенцкая

Б) прэзідэнцкая

В) змешаная

№4. *Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь адзначаецца як свята:*

*А) 3 ліпеня*

*Б) 27 ліпеня*

*В) 25 жніўня*

# Сучасная сталіца





ЯКУБ



КОЛАС









